А. М. Ненадавец

# Міфалогія
# роднага краю



Мінск
«Беларусь»
2018

УДК 398.4(=161.3)
ББК 82(4Беи)
Н51

Р э ц э н з е н т ы:
доктар мастацтвазнаўства *В. І. Жук,*
доктар філалагічных навук *А. С. Ліс*

**Ненадавец, А. М.**
Н51 Міфалогія роднага краю / А. М. Ненадавец. — Мінск : Беларусь, 2018. — 399 с.
ISBN 978-985-01-1271-2.

У кнізе аналізуецца міфалогія беларускага народа і паказана яе адлюстраванне ў разнастайных відах і жанрах традыцыйнай вусна-паэтычнай творчасці. Разгледжаны жанравыя асаблівасці, ідэйна-тэматычны змест.

Разлічана на работнікаў навуковых і культурна-асветных устаноў, выкладчыкаў вышэйшай і сярэдняй школы, аспірантаў і студэнтаў, а таксама ўсіх тых, хто цікавіцца беларускай міфалогіяй.

**УДК 398.4(=161.3)**
**ББК 82(4Беи)**

**ISBN 978-985-01-1271-2**

© Ненадавец А. М., 2018
© Афармленне. РУП «Выдавецтва «Беларусь», 2018

*Маім бацькам, дзядам і прадзедам*

# Замест уступу

Ўсебаковае даследаванне гістарычных лёсаў беларускага народа немагчыма без спасціжэння фундаментальных асноў фальклорнай традыцыі ва ўсіх яе формах і праявах. Шматлікія фальклорныя тэксты ўвабралі ў сябе выпрацаваныя традыцыйнай народнай культурай стэрэатыпныя спосабы бачання і ацэнкі свету, той «ментальны інструментарый», якім карысталася асноўная маса людзей на працягу стагоддзяў. Фальклор, які разумеецца не «музейна» (у якасці збору дасягненняў былых часоў), а як сведчанне сацыяльнай сутнасці народаў, уяўляецца неацэннай крыніцай пазнання культурна-гістарычнай спадчыны.

Вуснай народнай творчасці належыць важнейшая роля ў духоўным жыцці беларусаў пры ажыццяўленні шматлікіх сацыякультурных функцый, у тым ліку эстэтычнай, гнасеалагічнай, выхаваўчай, гульнёвай, светапогляднай. Значэнне фальклору як чыстай крыніцы мовы, як высокамастацкага пасрэдніка паміж мінулым, цяперашнім і будучым, як скарбніцы народнай мудрасці і мастацтва, як аднаго са сродкаў выхавання патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці патрабуе беражлівых адносін да гэтага духоўнага багацця, якое было перададзена нам продкамі.

Гісторыя фальклору — гэта перш за ўсё гісторыя чалавека, яго вылучэнне са свету прыроды і фарміраванне як істоты сацыяльнай. Гэты складаны працэс знайшоў сваё выражэнне, з аднаго боку, у развіцці ідэй гуманізму, з другога — у нарматыўных узорах асобы, якія рэалізуюцца людзьмі і ў паўсядзённай працы, і ў святы.

У кнізе даецца аналіз міфалогіі — своеасаблівай крыніцы беларускага фальклору. У міфапаэтычнай карціне свету апавяданне пра падзеі мінулых часоў з'яўляецца дактрынальным спосабам тлумачэння сучаснага стану прыроды і чалавека. Міфалагічнае звядзенне прычынна-выніковых сувязей да матэрыяльнай метамарфозы ў межах індывідуальнай з'явы ці падзеі, прэцэдэнту выводзіць акты тварэння на ўзровень узору, што падтрымлівае ўстаноўлены парадак (нават з дагістарычных часоў).

Цікава адзначыць тое, што само слова «міф» не мае вызначэння. Сцвярджаюць, што апошнім часам колькасць такіх значэнняў перабольшыла 70! Але мы ў дадзеным выпадку пойдзем ад працейшага: возьмем за аснову старажытнагрэчаскае тлумачэнне, якое азначае найперш «паданне», «апа-

вяданне», і, як вынік, атрымаецца, што адной з найбольш важных асаблівасцей міфа з'яўляецца прысутны ў ім элемент апавядальнасці. Нельга абысці ўвагай і тое, што навукоўцы пад міфам даволі часта разумеюць сістэму даўніх уяўленняў аб Сусвеце, аб глабальных зменах, якія ў ім адбываліся. І, адпаведна, міфамі называюцца тыя захапляльныя апавяданні, якія адлюстроўваюць шматлікія ўяўленні аб Сусвеце. Калі тлумачыць значэнне слова «міфалогія», то яно складаецца з дзвюх частак: ад грэч. *myfhos* — паданне і *logos* — слова.

Міфалогія ўключае ў сябе глабальную сістэму ўяўленняў аб Сусвеце і чалавеку, якая ўтварылася ў перыяд фарміравання патрыярхальнай самасвядомасці, але гэта зусім не азначае тое, што гэта нейкая навука (галіна) статычная ці незмяняльная. Міфалогія таксама прайшла працяглы і пакручасты шлях развіцця — ад найбольш прымітыўных міфаў, якія тлумачаць паходжанне або асобныя ўласцівасці жывёл і птушак ці апавядаюць аб падарожжах продкаў па «тым» і «гэтым» светах, і ажно да ўтварэння найбольш складаных і трывалых культаў вышэйшых язычніцкіх боствваў, іх пантэона, шматлікіх дэманалагічных персанажаў.

Элементы міфапаэтычнай карціны свету захоўваюцца ў народнай свядомасці на працягу гісторыі разам з элементамі філасофскіх і навуковых ведаў. Апісанне мадэлі свету і апавяданні (пра ўзнікненне прыродных і культурных аб'ектаў, пра дзеянні багоў і герояў) у сукупнасці складаюць той фон, якім карыстаюцца нашчадкі, як у разумовай дзейнасці, так і ў мастацкай творчасці, пры стварэнні пазнейшай паэтычнай сюжэтыкі і вобразнасці.

У грамадстве міфалогія амаль заўсёды выконвала рэгулятыўныя функцыі і выступала галоўным сродкам мабілізацыі гістарычнага вопыту дзеля яго актуальнага выкарыстання. У аснове ўсеагульнага закону жыцця Сусвету — ідэя пастаяннага ўзнаўлення традыцыйнай формы. Глыбінная мэта чалавечай жыццядзейнасці — пазнаць рытмы і цыклы Сусвету. Адпаведна, аснову ментальных установак калектыўнага творцы каляндарна-абрадавай паэзіі складае ідэя вечнага паўтарэння, а таксама ідэя нязначнасці і хуткаплыннасці чалавечага жыцця ў параўнанні з касмічнай гісторыяй. Галоўнай каштоўнасцю быцця з'яўлялася спасціжэнне найвышэйшага сакральнага сэнсу, а не рэалізацыя канкрэтных мэт. Жыццё ўяўляе сабою быццам бы бясконца працяглы рэлігійны ці касмаганічны абрад (рытуал), у якім удзельнічаюць і багі, і людзі.

Не здзіўляе, што ў міфалогіі развітых земляробчых народаў важную ролю заўсёды адыгрывалі каляндарныя міфы, а ў іх у сваю чаргу ў разгалінаванай сімвалічнай форме адлюстраваны цыклічны характар размеркавання (імкнуліся, бясспрэчна, да раўнамернага) сіл у прыродзе. Пастаянна падкрэслівалася, тлумачылася іх усёмагутнасць, усёразбуральнасць, але адначасова адзначалася і іх жыццядайнасць, жыццесцвярджальнасць. Тым самым нібы з даўніх часоў уводзіўся не толькі сярод людзей, але і сярод прыродных

сіл таксама прынцып своеасаблівай роўнасці, ці ўмоўнага падзелу прасторы і тэрыторыі на зоны добрых і благіх боствaў. Сярод іх — агульнавядомы факт валадарання (найбольш характэрным і паказальным з’яўляўся міф аб богу ці бостве, якое памірае і ажывае), які, праўда, мог быць «здробнены» паміж гэткімі ж боскімі персанажамі, а яго функцыі падзелены паміж іншымі багамі язычніцкага пантэона.

Міфатворчасць — найважнейшая з’ява ў культурнай гісторыі ўсяго чалавецтва. У першабытным грамадстве міфалогія ўяўляла сабою своеасаблівы спосаб асэнсавання свету і была першапачатковай формай духоўнай культуры тагачаснага грамадства. Тое, што ўспрыняцце свету, навакольных з’яў і прыроды першабытным чалавекам прыняло такую своеасаблівую форму як міфатворчасць, звязана з асаблівасцямі мыслення, уласцівымі гэтаму ўзроўню культурна-гістарычнага развіцця. Тады чалавек ніколі не вылучаў сябе са свету прыроды і свету соцыуму (грамадства). Для носьбіта міфалагічнай свядомасці асэнсаванне і эмацыянальнае ўспрыняцце навакольнага свету былі непарыўныя, непадзельныя. Таму прыродныя з’явы і аб’екты па-свойму быццам бы «ачалавечваліся», у міфах яны персаніфікаваныя: ім прыпісваліся людскія рысы, уласцівасці, дзеянні. Не дзіўна, таму што Сонца «каціла па небе на залацістай калясніцы», а рэкі нагадвалі сабою крывяносныя аорты маці-Зямлі.

Фальклор як галоўны носьбіт калектыўнага пачатку ў мастацкай творчасці адлюстроўвае ўсеагульнае панаванне міфа на ранніх стадыях грамадскага развіцця: міф канстытуе лад жыцця першабытнага, лакальна абмежаванага калектыву, які «замыкаўся» ў пэўных межах. Разам з тым міфалагічныя веды — каштоўнасныя і ў сваёй аснове сімвалічныя: у міфе яны адлюстроўваюцца ў форме мастацкага вобраза, які напоўнены пэўным сэнсам, з’яўляючыся вобразам-сімвалам. У інфарматыўным і эстэтычным сэнсе міф аказваецца багацейшы за рытуал і служыць свайго роду творчай лабараторыяй фальклору, а таксама і літаратуры, якая толькі зараджалася. Змест міфа для носьбіта міфалагічнай свядомасці ўспрымаецца як рэальнасць, а не як майстэрская выдумка; канкрэтнай («цвёрдай») мяжы паміж рэальным і звышнатуральным не існуе. Больш за тое, падзеі міфа амаль заўсёды асэнсоўваюцца як «вышэйшая рэальнасць», як заканамерная аснова, на якой усё адбываецца ў наступныя эпохі. У міфе адлюстраваны калектыўны і практычны вопыт многіх пакаленняў, якія і злучылі мінулае і сучаснае. Таму менавіта гэты вопыт, акумуляваны ў мудрасці продкаў і традыцыйных устаноўках, разглядаўся пастаянна як трывалая апора існага парадку, якая нават не падлягала праверцы, болей за тое, не патрабавала (і нават не дапускала) яе. Верагодна таму што міф як форма асэнсавання навакольнага свету суадносіцца з паняццем веры.

Найважнейшай прыметай міфа з’яўляецца яго сімвалізм, які нарадзіўся ў выніку невыразнага падзелу ў міфалагічнай свядомасці прадмета і знака, слова і рэчы, істоты і яе імя, прадмета і яго атрыбутаў, адзінкавага і шмат-

лікага, прасторавых і часавых адносін. Міфалагічнае мысленне аперыруе канкрэтнымі, знешнімі, пачуццёвымі якасцямі прадметаў. На аснове падабенства гэтых якасцей два прадметы могуць успрымацца як тоесныя, г.зн. абсалютна аднолькавыя. Канкрэтныя прадметы могуць станавіцца сімвалічнай заменай, знакам іншых прадметаў і з'яў. Для міфалагічнага мыслення ўсведамленне аднаго прадмета адбываецца праз характарыстыкі іншага.

У апошні час сярод беларускіх даследчыкаў фальклору выявілася значная зацікаўленасць да найбольш старажытных пластоў духоўнай спадчыны народа. Не стала выключэннем і народная міфалогія, прычым нават міфалогія хтанічнага свету (ад грэч. «хтон» — зямля), якую мы можам аднесці і да найбольш архаічнай, і да штодзённа ўжывальнай. Бо гэта тая частка вуснапаэтычнай творчасці, якая свята абагаўлялася толькі на золку чалавецтва, потым жа яна пачала пераходзіць у разрад «ніжэйшых» міфалагічных істот. Да іх адносіліся: дрэвы, камяні, вужы, гадзюкі і нават сама Зямля.

Спецыфічная рыса міфа — генетызм: у міфах заўсёды паходжанне прадмета выдаецца за яго існасць. Падрабязнае тлумачэнне існасці рэчы — гэта захапляльная гісторыя пра тое, як яна выраблялася; апісанне навакольнага свету — гэта асаблівы аповед аб яго паходжанні. Так, любая з'ява ў свеце: ландшафтныя аб'екты на зямлі, нябесныя свяцілы, пароды жывёл і віды раслін, народы і іх заняткі, звычаі, абрады — для міфалагічнай свядомасці аказваецца наступствам падзей старажытных часоў, а таксама падзей і здзяйсненняў міфічных продкаў, багоў і герояў. Пры гэтым час расказвання міфа і час падзей, пра якія ў ім гаворыцца, заўсёды абавязкова аддзелены адзін ад аднаго дзесяцігоддзямі, вякамі, тысячагоддзямі: «даўным-даўно ўсё гэта адбывалася», «за сівымі стагоддзямі дзеялася», «тысячу, а можа і болей, гадоў таму назад усё зрабілася», «тады адбывалася, калі дрэвы на зямлі былі малыя» і г. д.

Многія міфы ўяўляюць сабою своеасаблівыя тлумачэнні рэлігійных абрадаў (гэтак званыя культавыя міфы). Выканаўца абраду імкнуўся да драбніц аднавіць падзеі, якія апавядаюцца ў міфе. У старажытных культурах міф і абрад складаюць адзінства і выступаюць як два ўзаемазлучальныя бакі: адзін — моўны, «тэарэтычны», а другі — дзейсны, «практычны». Таму міф, хоць ён і выглядае як аповед, як тоеснасць спецыфічна аформленых «апавяданняў», — гэта не моўны жанр (хоць у нечым вельмі нагадвае казку), а акрэсленае (пэўнае) уяўленне аб свеце, якое даволі часта толькі прымае форму апавядальнасці. Міфалагічнае светаўспрыняцце можа рэалізавацца таксама і ў іншых формах — дзеяннях, песнях, танцах і г. д. Таму заканамерна, што раней міфы складалі свяшчэнную духоўную спадчыну соцыуму. Яны былі звязаны са сфарміраванымі ў іх традыцыямі, сцвярджалі прынятую ў дадзеным грамадстве сістэму каштоўнасцей, усталёўвалі і падтрымлівалі нормы паводзін. Навакольны свет і месца чалавека ў ім тлумачыліся ў міфе такім чынам, каб забяспечыць падтрымку існага парадку, а ў некаторых выпадках — і падтрымку канонаў сацыяльнага ладу.

Да нас амаль што не дайшлі багатыя духоўныя «воблікі» язычніцкіх багоў, гэтак, скажам, як у грэкаў ці рымлян, але была шматразвітая «ніжэйшая» міфалогія (Ф. І. Буслаеў), якая, нягледзячы на тое, што пастаянна адчувала на сабе актыўнае ўздзеянне хрысціянскай веры, многае захавала ў першапачатковым выглядзе і да цяперашняга часу. Тым больш што ва ўсіх усходнеславянскіх народаў, ды і не толькі ў іх, міфалогія заўсёды вывучалася даволі аднолькава і аднабакова — часцей за ўсё асвятлялася і падрабязна тлумачылася толькі тая частка, якая была звязана з багамі, і вельмі рэдка згадвалася пра зямны, хтанічны свет. Менавіта таму ў старажытных першакрыніцах нашай народнай міфалогіі і рэлігіі ў ліку асноўных боскіх істот разглядаліся толькі нябесныя. Аднак з-за такіх адносін атрымалася, што запісы беларускай міфалогіі, а іх у першапачатковым выглядзе знайсці амаль немагчыма, грашаць празмернай фрагментарнасцю. З самой нацыянальнай вуснай творчасці, у якой даволі шырока выкарыстоўваліся паасобныя элементы хтанічных міфалагічных сродкаў, для вырашэння праблем міфалогіі (няхай сабе і самых складаных) бралася іх мізэрная колькасць. У той жа час уяўленне аб беларускай міфалогіі было б, вядома ж, няпоўным без даследавання яе хтанічнага, жывёльнага і расліннага свету. Яны ўключаюць у сябе адны з самых вядомых і папулярных міфалагічных архетыпаў.

Вобразы Зямлі, дуба, гадаў сустракаюцца ва ўсіх без выключэння жанрах фальклору, у народным мастацтве, гутарковай мове. Навукова абгрунтаваны аналіз існасці і генезісу канкрэтных спрадвечных вобразаў дасць магчымасць зразумець і правільна ацаніць іх выкарыстанне ў розных сферах традыцыйнай культуры і сучаснага мастацтва. Без падрабязнага аналізу цяжка ўжыць цесна звязаныя з імі матэрыялы і для эстэтычнага выхавання, дзе іх значэнне, мабыць, яшчэ да гэтага часу так і не акрэслена, бо пасля гвалтоўнай хрысціянізацыі Беларусі міфалагічныя персанажы царкоўнікамі або ўмела выкарыстоўваліся ў сваіх жа мэтах (Зямля, дуб), або свядома замоўчваліся ці нават пераносіліся ў лагер, супрацьлеглы традыцыйнай, народнай, «ніжэйшай» міфалогіі (вуж, гадзюка). Названыя вобразы згадваюцца ў навуковых працах, прысвечаных беларускай міфалогіі, але падрабязнага, грунтоўнага аналізу прадстаўнікоў «ніжэйшай» міфалогіі пакуль што ў навуковым ужытку не стае. Часам даследчыкі ўвогуле не кранаюць пералічаных намі персанажаў, бо лічаць іх прадстаўнікамі хрысціянскай веры (асабліва слова «зямля»), якія ніяк не злучаны з беларускімі традыцыямі.

Абавязкова адзначым, што з развіццём грамадства міфалогія таксама змянялася; больш дакладным будзе сцвярджэнне, што з расслаеннем грамадства на класы гэтаксама расслойвалася і міфалогія. Сацыяльныя змены патрабавалі такіх неадкладных зрухаў. Таму пачалі з'яўляцца ўсялякія міфалагічныя творы пра багоў і герояў (у беларускім варыянце — асілкаў), якія выступалі заснавальнікамі («прабацькамі») пэўных арыстакратычных родаў. Недзе менавіта ў тым асяроддзі ўзнікалі сюжэты, якія паступова прывялі да фар-

міравання «вышэйшай», або боскай, міфалогіі. Гэта было не што іншае, як вусна-паэтычнае абгрунтаванне стварэння язычніцкага пантэона вышэйшых бостваў.

Улічым і той факт, што адначасова развівалася (пашыралася, укаранялася) «ніжэйшая» міфалогія, асабліва сярод бяднейшай часткі насельніцтва. Нічога дзіўнага ў гэтым няма. У багатых былі свае багі, культы, аб’екты шанавання і пакланення, у бедных, адпаведна, свае. І боствы апошніх, ці, як іх яшчэ называлі, дэманалагічныя персанажы (назва ўзнікла не без дапамогі хрысціянскага духавенства), былі звязаны найперш з сіламі і з’явамі прыроды, яе стыхіямі, з магчымасцю актыўна ўплываць на ўрадлівасць зямлі, на раслінны свет, выклікаць актыўныя зрухі вегетатыўнай сілы. Чалавек працы заўсёды думаў пра тое, каб праца абавязкова дала плён — адным словам, каб быў добры ўраджай, бо ад гэтага наўпрост залежала існаванне жыцця не толькі яго самога, але і ўсёй сям’і, усяго роду, што ў тыя часы было асабліва важна. Гэтая актуальнасць вегетатыўных культаў прывяла да таго, што ў беларускай міфалогіі найбольш поўна і трывала захаваўся менавіта пласт «ніжэйшай» міфалогіі. Захаваўся да нашага часу. У многім амаль што нязменным, цэласным, нягледзячы на разнастайныя ўціскі, ганенні, змены і г. д.

Цікавасць да ўзятых для разгляду міфалагічных істот праявілася ў апошнія дзесяцігоддзі. Пасля таго як адносна тэрмінаў «зямля» і «змяя» даказалі, а ў некаторых выпадках прапанавалі слушныя гіпотэзы блізкасці іх назваў і асноўных функцый да старажытных індаеўрапейскіх багоў, якія абагаўляліся амаль усімі без выключэння народамі. На аснове вось гэтых прадбачлівых назіранняў і прадказанняў прааналізаваны шматлікія смелыя гіпотэзы адносна месца і значэння персанажаў «ніжэйшага» міфалагічнага рада ў старажытнай беларускай міфалогіі.

Зямля спрадвеку была свяшчэннай, дуб абагаўлялі не толькі беларусы, але амаль усе народы, якія ведалі гэта дрэва, а вуж і гадзюка ў беларускай народнай міфалогіі ўвогуле мелі найбольш характэрныя цудадзейныя рысы. Вядома, не ўсе гіпотэзы вытрымліваюць праверку фактамі і часам, але, тым не менш, яны ўзбагачаюць даследчыкаў, бо адкрываюць нейкія новыя, раней нябачныя грані старажытнага архетыпа, карані радаводу якога добра не вывучаны і да гэтага часу. Большасць гэтых гіпотэз абапіралася на агульнавядомыя факты беларускага фальклору, этымалогію імёнаў нашых архетыпаў і іх сувязі, падабенства з індаеўрапейскімі і агульнаславянскімі вобразамі. Можна адзначыць таксама, што шырэй з узятых для разгляду намі хтанічных істот вывучаны архетып дуба, і то не ў нас, а ў замежнай фалькларыстыцы і міфалогіі, у нашых найбольш блізкіх суседзяў — літоўцаў і ўкраінцаў.

Улічваючы папулярнасць вобразаў «ніжэйшай» міфалогіі ў беларускім фальклоры, характар і абмежаваны маштаб папярэдніх даследаванняў, вывучэнне іх магчыма ў самых розных, самых нечаканых аспектах. Абавязкова патрэбна спыніцца на асаблівасцях адлюстравання гэтых істот у фальклор-

ных творах розных жанраў (казках і паданнях, былічках і замовах, легендах і песнях). Але гэтакая шматжанравая накіраванасць аналізу паставіла б шэраг цяжкасцей у асвятленні ўзятых для разгляду вобразаў ва ўсёй іх цэласнасці, выяўленні агульных рыс, раскрыцці іх зместу і існасці. Улічваючы, што вобразы хтанічных персанажаў фарміраваліся ў беларускай народнай міфалогіі, якая была па-свойму акрэслена бытам, сацыяльным жыццём і светапоглядам народа, у нашай працы яны даследуюцца перш за ўсё як частка пастаянна зменлівай сістэмы з мэтай адзначыць найбольш агульную іх міфалагічную існасць, месца, якое яны займалі ў старажытнай рэлігіі (маецца на ўвазе эпоха язычніцтва) і міфалогіі, прычыны ўзнікнення іх у свядомасці чалавека-працаўніка, эвалюцыю ў ходзе гістарычнага развіцця, узаемаадносіны з іншымі беларускімі і іншанацыянальнымі міфалагічнымі архетыпамі. Выяўленне агульных рыс міфалагічных істот «ніжэйшага» рада дасць магчымасць закласці аснову для далейшага вывучэння асобных жанраў фальклору, у якіх гэтыя вобразы закранаюцца ў тым ці іншым аспекце.

Нельга не згадаць і пра тое, што язычніцкі пантэон вярхоўных бостваў (яго стасункі з «ніжэйшай» міфалогіяй, з легендарнымі героямі і асобамі) не выступаў такім цэласным і ўпарадкаваным, як, напрыклад, у славутых грэчаскіх ці рымскіх міфах, дзе ўсё было «адшліфавана» да драбніц. У славянскай міфалогіі, а ў беларускай тым болей, існавалі ў гэтым накірунку «белыя пляміны» — не ахопленыя Боскай увагай і ўладай прасторы і тэрыторыі, а самі багі не вылучаліся, у пераважнай большасці, нейкай выразнасцю, акрэсленасцю, характэрнымі рысамі і ўласцівасцямі, а былі, наадварот, невыразнымі, «бясформеннымі». У лепшым выпадку, насілі ўласнае імя, мелі свайго ідала (матэрыяльна аформленую выяву) — і ўсё на тым!

Вышэйшыя міфалагічныя (язычніцкія) боствы нацыянальнай міфалогіі амаль увогуле не вывучаліся і не закраналіся беларускімі даследчыкамі. Тлумачыцца гэта найперш тым, што не дазвалялася даследаваць мінуўшчыну, бо яе прылічвалі да «цемрашальства мінулых стагоддзяў», а таксама тым, што надзвычай мала звестак дайшло да нас пра тыя велічныя і каранічныя абрады ды культы, якія некалі існавалі на тутэйшых землях. Найбольш пашчасціла захаваць свае ўласцівасці і рысы Перуну, Калядзе, Купале, Вялесу-Валосу, астатнія ж нібы растварыліся ў моры хрысціянскай рэлігіі, прыстасаваліся да яе святых і свят.

Прычына недаследаванасці бачыцца нам і ў банальным… нежаданні вучоных брацца за ўсебаковы аналіз малавядомай праблемы. Прызвычаіліся займацца тым, што на гэты момант было папулярным, давала магчымасць атрымаць хуткі вынік, выкарыстаць яго для росту ўласнай кар’еры. Ды і не модная тады была такая навука, як міфалогія, атаясамлівалася яна ў вачах усяго астатняга грамадства з… цемрашальствам, невуцтвам. Час быў такі. Нават не час, а толькі перыяд, але, тым не меней, аслухвацца партыйных пастаноў і ўказаў было небяспечна. У апошнія два дзесяцігоддзі сітуацыя змянілася да

# Заключэнне

Беларуская народная міфалогія — з'ява ў многім унікальная. У ёй шмат што нам незразумела да гэтага часу. Напрыклад, чаму ў такіх наіўных, здавалася б, творах уздымаліся надзвычай актуальныя праблемы, якія і ў нашы дні не страцілі сваёй надзённасці? Дзе знайсці першавытокі ўсяго гэтага? Чаму супрацьпастаўленне дабра і зла суправаджала людзей ад самага стварэння роду чалавечага і да нашых дзён? Больш за тое, пытанне гэтае ўзрасло да агромністай глабальнасці і здаецца нам цяпер увогуле невырашальным. Нам бачыцца і такое тлумачэнне, можа ў нечым яно і надзвычай спрошчанае. Праблемы ўзнікалі ў выніку панічнага страху перад прыродай, перад яе магутнымі стыхіямі, з нараджэннем свядомасці ў нашых далёкіх продкаў. Не магло так быць, што ўсе ўяўляліся роўнымі, аднолькавымі. Усё роўна нехта кіраваў, загадваў, а гэта, бясспрэчна, выклікала «чорную зайздрасць», як яе называюць у нашым народзе. Менавіта гэта, як лічаць у большасці выпадкаў сучасныя інфарматары, і спрыяла рэзкаму, палярнаму супрацьпастаўленню дабра і зла.

Хто яго ведае. Жыццё цякло, змянялася. Эпоха змяняла эпоху, фармацыя — фармацыю, а народная міфалогія, нібы тая своеасаблівая губка, усмоктвала ў сябе найбольш характэрныя рысы і асаблівасці пэўнага часу. Дзякуючы міфалогіі і фальклору мы маем амаль дакладныя звесткі аб духоўных памкненнях старажытных беларусаў. Менавіта ў міфалогіі і вусна-паэтычных жанрах адлюстроўваліся нават найдрабнейшыя зрухі ў свядомасці народа, яго спадзяванні і вера ў тое, што ўсё роўна ўсё ліхое міне і чалавек дачакаецца такога жыцця, якога ён заслугоўвае сваёй самаадданай працай, пакутамі і шматлікімі выпрабаваннямі нядобразычліўцы-лёсу. Таму нядзіўна, што нават на дэманалагічных істот пераносіліся рысы людскіх характараў. Праўда, з цягам шматлікіх стагоддзяў, у выніку розных сацыяльных і эканамічных зрухаў, многае з міфалагічных першавобразаў назаўсёды страчана. Яго ўжо проста немагчыма (нават пры ўсім нашым жаданні) вярнуць, аднавіць. Змагацца трэба за тое, што яшчэ жыве, захавалася, занатавана даследчыкамі і збіральнікамі-аматарамі, якія таксама шмат робяць для найбольш поўнага захавання міфалагічных шэдэўраў. Добра будзе, калі і нашы нашчадкі будуць мець магчымасць судакрануцца з найбагацейшымі першавытокамі народнай мудрасці, свядомасці, памяці.

# Спіс выкарыстанай літаратуры


*Ажэшка, Э.* Аповесці. Апавяданні. Нарысы / Э. Ажэшка. Мінск, 2000.

*Аникин, В. П.* Русская народная сказка / В. П. Аникин. М., 1977.

*Аничков, Е. В.* Язычество и Древняя Русь / Е. В. Аничков. СПб., 1914.

*Афанасьев, А. Н.* Дерево жизни / А. Н. Афанасьев. М., 1982.

*Афанасьев, А. Н.* Живая вода и вещее слово / А. Н. Афанасьев. М., 1988.

*Афанасьев, А. Н.* Поэтические воззрения славян на природу : в 3 т. / А. Н. Афанасьев. М., 1995. Т. 1.

*Багрянорадный, К.* Об управлении государством / К. Багрянорадный // Известия государственной Академии истории материальной культуры. М. ; Л., 1934. Вып. 91.

Балады : у 2 кн. / уклад. Л. М. Салавей, Т. А. Дубкова. Мінск, 1977. Кн. 1.

*Барсов, Е.* Критические заметки об историческом и художественном значении «Слова о полку Игореве» / Е. Барсов // Вестник Европы. СПб., 1878. Кн. 10.

*Барташэвіч, Г. А.* Магічнае слова / Г. А. Барташэвіч. Мінск, 1990.

*Баршчэўскі , Я.* Шляхціч Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўскі. Мінск, 1992.

Беларуская міфалогія : энцыклапедычны слоўнік / С. Санько [і інш.]. Мінск, 2004.

Беларускі фальклор : хрэстаматыя / уклад. К. П. Кабашнікаў [і інш.]. Мінск, 1977.

Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / уклад. В. Д. Ліцвінка, Г. Р. Кутырова. Мінск, 1995.

Беларусы : у 8 т. / рэдкал. : В. К. Бандарчык, М. Ф. Піліпенка, В. С. Цітоў. Мінск, 1995. Т. 1.

*Бессонов, П. А.* Белорусские песни с подробными объяснениями их творчества и языка, с очерками народного обряда, обычая и всего быта / П. А. Бессонов. М., 1871.

Библия. Книги Священного Писания Ветхого и Нового Завета. М., 1988.

*Бируни, Абу Рейхан.* Избранные произведения : в 2 т. / Абу Рейхан Бируни. М., 1963. Т. 2.

*Бломквист, Е. Э.* Крестьянские постройки русских, украинцев и белорусов / Е. Э. Бломквист // Восточнославянский этнографический сборник. М., 1956.

*Богданов, В. В.* Древние и современные обряды погребения животных в России / В. В. Богданов // Этнографическое обозрение. СПб., 1916. № 3—4.

*Богданович, А. Е.* Пережитки древнего миросозерцания у белорусов / А. Е. Богданович. Гродно, 1895.

*Боровский, Я. Н.* Мифологический мир древних киевлян / Я. Н. Боровский. Киев, 1982.

*Булгаковский, Д. Г.* Пинчуки. Этнографический сборник : песни, загадки, пословицы, обряды, приметы, предрассудки, поверья, суеверья и местный словарь /

Д. Г. Булгаковский // Записки Императорского Русского географического общества по отделению этнографии. СПб., 1890. Т. 13. Вып. 3.

*Буслаев, Ф. И.* Исторические очерки русской народной словесности и искусства : в 2 т. / Ф. И. Буслаев. СПб., 1861. Т. 2.

*Буслаев, Ф. И.* О литературе. Исследования. Статьи / Ф. И. Буслаев. М., 1990.

Валачобныя песні. Мінск, 1987.

*Велюс, Н.* Хтонический мир литовской мифологии. Анализ фольклорного Вяльняса : автореф. дис. … д-ра филол. наук : 10.01.09 / Н. Велюс. Вильнюс, 1987.

*Вентухов, А*. Заговоры, заклинания, обереги и другие виды народного врачевания, основанные на вере в силу слова: Из истории мысли / А. Вентухов. Варшава, 1907. Вып. 1—2.

*Виноградов, В. П.* Место египетских амулетов в религиозно-магических символах кавказцев / В. П. Виноградов // Археолого-этнографический сборник. Грозный, 1967. Т. 2.

*Виноградова, Л. Н.* Береза / Л. Н. Виноградова, В. В. Усачева // Славянская мифология : энциклопедический словарь. М., 1995.

*Владимиров, П. В.* Южнорусское житие св. Владимира XVII в. / П. В. Владимиров // Киевская старина. Приложение. 1889. Т. 24. № 2.

Восеньскія і талочныя песні / уклад. А. С. Ліс, С. Т. Асташэвіч. Мінск, 1981.

Воспоминания о Михаиле Пришвине : сборник / сост. Я. З. Гришина, Л. А. Рязанова. М., 1991.

*Гальковский, Н. М.* Борьба христианства с остатками язычества в Древней Руси : в 2 т. / Н. М. Гальковский. Харьков, 1916. Т. 1.

*Гельмольд.* Славянская хроника / Гельмольд. М., 1963.

*Гемуев, И. Н.* Легенды и были таежного края / И. Н. Гемуев, А. М. Сагалаев, В. И. Соловьев. Новосибирск, 1989.

*Гілевіч, Н. С.* Паэтыка беларускай народнай лірыкі. Слова і вобраз. Паэтычны сінтаксіс. Гукапіс і рыфма / Н. С. Гілевіч. Мінск, 1976.

*Гілевіч, Н. С.* Песні народных свят і абрадаў / Н. С. Гілевіч. Мінск, 1974.

*Голан, А.* Миф и символ / А. Голан. М., 1994.

Грамоти 14 ст. / упоряд. М. М. Пещак. Київ, 1974.

*Гусева, Н. Р.* К вопросу о значении некоторых персонажей славянского язычества. Личные имена в прошлом, настоящем, будущем / Н. Р. Гусева. М., 1970.

*Даль, В. И.* О повериях, суевериях и предрассудках русского народа / В. И. Даль. СПб., 1994.

*Даль, В. И.* Толковый словарь живого великорусского языка : в 4 т. / В. И. Даль. М., 1978. Т. 1.

*Данилюк, А. Г.* Українська хата / А. Г. Данилюк. Київ, 1991.

*Дембовецкий, А. С.* Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом … отношениях : в 3 кн. / А. С. Дембовецкий. Могилев-на-Днепре, 1882. Кн. 1.

*Демидович, П. И.* Из области верований и сказаний белорусов / П. И. Демидович // Этнографическое обозрение. М., 1896. № 1—3.

*Докторов, В. Г.* Небесные покровители христиан / В. Г. Докторов. Минск, 1989.

Древнерусские княжеские уставы XI—XV вв. / сост. Я. Н. Щапов. М., 1976.

Живая старина. 1908. Вып. 1.

Живописная Россия : Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, и бытовом значении : репринтное воспроизведение издания 1882 г. Минск, 1993.

Жніўныя песні / уклад. Д. Жураўлёў, Г. Цітовіч. Мінск, 1974.

Замовы / уклад. Г. А. Барташэвіч. Мінск, 1992.

Записки Северо-Западного отдела русского географического общества. Вильно, 1911. Кн. 2.

*Зеленин, Д. К.* Восточнославянская этнография / Д. К. Зеленин. М., 1991.

*Зеленин, Д. К.* Очерки русской мифологии / Д. К. Зеленин. Петроград, 1916.

*Зеленин, Д. К.* Тотемический культ деревьев у русских и белорусов / Д. К. Зеленин // Изв. АН СССР. Отд. общ. наук. 1933. № 6.

*Зеленин, Д. К.* Тотемы-деревья в сказаниях и обрядах европейских народов / Д. К. Зеленин // Труды института антропологии и этнографии. М.; Л., 1937.

Земляробчы каляндар : Абрады і звычаі / уклад. А. І. Гурскі, А. С. Ліс. Мінск, 1990.

*Ивакин, Г. Ю.* Священный дуб языческих славян / Г. Ю. Ивакин // СЭ. 1979. № 2.

*Иванов, В. В.* Исследования в области славянской древности / В. В. Иванов, В. Н. Топоров. М., 1974.

*Иванов, В. В.* Славянские языковые моделирующие саннотические системы / В. В. Иванов, В. Н. Топоров. М., 1965.

*Иванов, В. В.* Этимология / В. В. Иванов, В. Н. Топоров. М., 1967.

*Иванов Вс.* Повести древних лет / Вс. Иванов. Л., 1985.

*Иорданский, В. Б.* Звери, люди, боги. Очерки африканской мифологии / В. Б. Иорданский. М., 1991.

Ипатьевская летопись. ПСРЛ. М., 1962. Т. 2.

История культуры Древней Руси / под общ. ред. Б. Д. Грекова и М. И. Артамонова. М. ; Л., 1952. Т. 2.

*Каганкатваци, Моисей.* История агван / Моисей Каганкатваци. СПб., 1914.

Казкі ў сучасных запісах / уклад. К. П. Кабашнікаў, Г. А. Барташэвіч. Мінск, 1989.

Калевала. М., 1956.

*Карамзин, Н. М.* История государства Российского : в 4 кн. / Н. М. Карамзин. Ростов-н/Д., 1990.

*Караткевіч, У.* Выбраныя творы : у 2 т. / У. Караткевіч. Мінск, 1976. Т. 2.

*Караткевіч, У.* Творы : у 8 т. / У. Караткевіч. Мінск, 1991. Т. 8. Кн. 1.

*Карский, Е. Ф.* Белорусы : в 3 т. / Е. Ф. Карский. М., 1916. Т. 3. Вып. 1.

*Киркор, А.* Этнографический взгляд на Виленскую губернию / А. Киркор // Этнографическое обозрение. СПб., 1858. Вып. 3.

*Колас, Якуб.* Зборнік твораў : у 14 т. / Якуб Колас. Мінск, 1973. Т. 4.

*Колчин, А.* Верования крестьян Тульской губернии / А. Колчин. М., 1972.

*Конан, У. М.* Ля вытокаў самапазнання / У. М. Конан. Мінск, 1989.

*Костомаров, Н. И.* Славянская мифология / Н. И. Костомаров. Киев, 1994.

Купальскія і пятроўскія песні / уклад. А. С. Ліс, С. Т. Асташэвіч. Мінск, 1985.

*Лакотка, А. І.* Пад стрэхамі прашчураў / А. І. Лакотка. Мінск, 1995.

*Лебедев, Г. С.* Эпоха викингов в Северной Европе / Г. С. Лебедев. Л., 1985.

Легенды і паданні / уклад. М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі. Мінск, 1983.

*Ленсу, Е. Я.* Фольклорные традиции в дооктябрьском творчестве Янки Купалы / Е. Я. Ленсу. Минск, 1965.

*Липинская, Я.* Мифология Древнего Египта / Я. Липинская, И. Марциняк. М., 1983.

*Ліс, А. С.* Купальскія песні / А. С. Ліс. Мінск, 1974.

Литовская литература // Энциклопедический словарь / под ред. проф. И. Е. Андреевского. СПб., 1890—1907. Т. 17-А.

*Лозка, А. Ю.* Беларускі каляндар у славянскім і еўрапейскім свеце / А. Ю. Лозка. Мінск, 2002.

*Лозка, А. Ю.* Беларускі народны каляндар / А. Ю. Лозка, Мінск, 1993.

*Ляўкоў, Э. А.* Маўклівыя сведкі мінуўшчыны / Э. А. Ляўкоў. Мінск, 1992.

*Ляцкий, Е. А.* Представление белоруса о нечистой силе / Е. А. Ляцкий // Этнографическое обозрение. М., 1890. Кн. 7.

*Майков, Л. Н.* Великорусские заклинания / Л. Н. Майков. СПб., 1994.

*Максимов, С. В.* Избранные произведения : в 2 т. / С. В. Максимов. М., 1987.

*Максимов, С. В.* Литературные путешествия / С. В. Максимов. М., 1986.

*Максимов, С. В.* Нечистая, неведомая и крестная сила. Куль хлеба / С. В. Максимов. Смоленск, 1995.

*Максимович, М. А.* Собр. соч. : в 2 т. / М. А. Максимович. Киев, 1877. Т. 2.

*Максимович, М. О.* Дні та місяці українського селянина / М. О. Максимович. Київ, 2002.

*Маркс. К.* О религии / К. Маркс, Ф. Энгельс, В. И. Ленин. М., 1975.

*Марціновіч, А.* У сваю дывізію пайшоў / А. Марціновіч // Полымя. 2000. № 3.

Матерь Лада. Божественное родословие славян / сост. Д. М. Дудко. М., 2002.

*Мачинский, Д. А.* «Дунай» русского фольклора на фоне восточнославянской истории и мифологии / Д. А. Мачинский // Русский Север. Проблемы этнографии и фольклора. Л., 1981.

*Мелетинский, Е. М.* Поэтика мифа / Е. М. Мелетинский. М., 1976.

*Миллер, О. Ф.* Опыт исторического обозрения русской словесности, с хрестоматиею, расположенною по эпохам / О. Ф. Миллер. СПб., 1865. Ч. 1.

Минский листок. Минск, 1894. № 90.

*Миролюбов, Ю.* Сакральное Руси : в 2 т. / Ю. Миролюбов. М., 1996. Т. 2.

Мифологический словарь / под ред. Е. М. Мелетинского. М., 1990.

Міфы бацькаўшчыны / уклад. У. Васілевіч. Мінск, 1994.

Мифы народов мира : энциклопедия : в 2 т. М., 1987. Т. 1.

*Моторов, Г. Г.* Формирование средневековой философии / Г. Г. Моторов. М., 1979.

*Мяло, И.* Принада / И. Мяло. Минск, 1982.

*Ненадавец, А. М.* Замак ведзьмы / А. М. Ненадавец. Чарнігаў, 2008.

*Ненадавец, А. М.* За смугою міфа / А. М. Ненадавец. Мінск, 2005.

*Ненадавец, А. М.* Каму пакланяліся продкі / А. М. Ненадавец. Мінск, 1995.

*Ненадавец, А. М.* Пакланіцеся дубу / А. М. Ненадавец. Мінск, 1993.

*Ненадавец, А. М.* Праклятыя словам / А. М. Ненадавец. Бабруйск, 2006.

*Ненадавец, А. М.* Святло таямнічага вогнішча / А. М. Ненадавец. Мінск, 1993.

*Ненадавец, А. М.* Сілаю слова. Белая і чорная магія / А. М. Ненадавец. Мінск, 2002.

*Ненадавец, А. М.* Чароўныя змеі / А. М. Ненадавец. Бабруйск, 2007.

*Ненадавец, А. М.* Чорт у легендах і паданнях беларусаў / А. М. Ненадавец. Мінск, 2005.

*Никифоровский, Н. Я.* Нечистики. Свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе / Н. Я. Никифоровский. Вильна, 1907.

*Никифоровский, Н. Я.* Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н. Я. Никифоровский. Витебск, 1897.

*Никольский, Н. М.* История русской церкви / Н. М. Никольский. Минск, 1990.

Обряды и обрядовый фольклор. М., 1986. Т. 2.

*Оля, Б.* Боги тропической Африки / Б. Оля. М., 1976.

*Орлов, М. А.* История сношений человека с дьяволом / М. А. Орлов. М., 1991.

Откуда есть пошла Русская земля : в 2 кн. / сост. А. Г. Кузьмин. М., 1986. Кн. 2.

Палескае вяселле / уклад. і рэд. В. А. Захарава. Мінск, 1984.

*Парнов, В. И.* Звездные знаки / В. И. Парнов. М., 1984.

Пахаванні. Памінкі. Галашэнні / рэдкал. : В. К. Бандарчык, А. С. Фядосік [і інш.]. Мінск, 1986.

Паэзія беларускага земляробчага календара / уклад. А. С. Ліс. Мінск, 1992.

*Писаренко, Ю. Г.* Велес-Волос в язичницькому світогляді давньоі Русі / Ю. Г. Писаренко. Київ, 1997.

*Платов, А.* Бой на калиновом мосту / А. Платов // Мифы и магия индоевропейцев. М., 1998. Вып. 5.

Повесть временных лет / подгот. текста Д. С. Лихачева; пер. Д. С. Лихачева и Б. А. Романова; под ред. В. П. Адриановой-Перетц. М. ; Л., 1950. Ч. 1—2.

Полное собрание русских летописей. М., 1975. Т. 32.

*Потебня, А. А.* О некоторых символах в славянской народной поэзии / А. А. Потебня. Харьков, 1914.

*Преображенский, А. Г.* Этимологический словарь русского языка / А. Г. Преображенский. М., 1958.

Прибавление к Ипатьевской летописи: Густинская летопись // ПСРЛ. СПб., 1843. Т. 2.

*Пропп, В. Я.* Исторические корни волшебной сказки / В. Я. Пропп. Л., 1986.

*Пропп, В. Я.* Поэтика фольклора / В. Я. Пропп. М., 1998.

*Пропп, В. Я.* Русские аграрные праздники: опыт историко-этнографического исследования / В. Я. Пропп. Л., 1963.

Прыказкі і прымаўкі : у 2 кн. / рэд. А. С. Фядосік. Мінск, 1976. Кн. 1.

*Пщелко, А. Р.* Древнеславянские праздники / А. Р. Пщелко // Витебские губернские ведомости. 1904. № 165.

*Пяткевіч, Часлаў.* Рэчыцкае Палессе / Часлаў Пяткевіч. Мінск, 2004.

*Романов, Е. Р.* Белорусский сборник / Е. Р. Романов. Вильна, 1908. Вып. 5.

*Романов, Е. Р.* Белорусский сборник / Е. Р. Романов. Вильна, 1912. Вып. 8.

Русский демонологический словарь / сост. Т. А. Новичкова. М., 1993.

Русский народ : его обычаи, предания, суеверия и поэзия / собр. М. Забылиным. М., 1990.

*Рыбаков, Б. А.* Язычество древних славян / Б. А. Рыбаков. М., 1981.

*Рыбаков, Б. А.* Язычество Древней Руси / Б. А. Рыбаков. М., 1987.

*Сабинин, С.* Волос, языческое божество славяно-руссов, сравненное с Одином скандинавов / С. Сабинин // ЖМНП. СПб., 1843. № 10.

*Сакол, Пятро.* Дайны. Латышскія народныя песні / Пятро Сакол. Мінск, 1987.

Сакральный календарь друидов / ред. А. Шапошников, В. Татаринов. М., 2001.

*Сахаров, А. Н.* Дипломатия Древней Руси: IX — первая половина X в. / А. Н. Сахаров. М., 1980.

Сацыяльна-бытавыя казкі / рэд. В. К. Бандарчык. Мінск, 1976.

*Сержпутовский, А. К.* Сказки и рассказы белорусов-полешуков / А. К. Сержпутовский. Минск, 1999.

*Сержпутоўскі, А. К.* Казкі і апавяданні беларусаў Слуцкага павета / А. К. Сержпутоўскі. Мінск, 2000.

*Сержпутоўскі, А. К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. Мінск, 1998.

Сказания русского народа, собранные И. П. Сахаровым. М., 1990.

Слово о полку Игореве / вступ. ст. и подг. древнерус. текста Д. Лихачева; сост. Л. Дмитриева. М., 1987.

*Соболевский, А. И.* Памятники древнерусской литературы, посвященные Владимиру Святому / А. И. Соболевский // ЧИОНЛ. Киев, 1888, Кн. 2. Отд. 2.

*Соколова, З. П.* Животные в религиях / З. П. Соколова. СПб., 1998.

*Соловьев, С. М.* Сочинения : в 18 кн. / С. М. Соловьев. М., 1988. Кн. 1.

Старшая Эдда / пер. А. И. Корсуна ; под ред. М. И. Стеблин-Каменского. М. ; Л., 1963.

Суеверия и предрассудки в Могилевской губернии // Могилевские губернские ведомости. 1894. № 6—8.

*Сумцов, Н. Ф.* Символика славянских обрядов. Избранные труды / Н. Ф. Сумцов. М., 1996.

*Сысоў, У. М.* З крыніц спрадвечных / У. М. Сысоў. Мінск, 1997.

*Тайлор, Э. Б.* Первобытная культура / Э. Б. Тайлор. М., 1989.

*Тернер, В.* Символ и ритуал / В. Тернер. М., 1983.

*Тихоницкая, Н. Н.* Русская народная игра «Просо сеяли» / Н. Н. Тихоницкая // Славянская этнография. М., 1938. № 1.

*Тихонравов, Н.* Памятники отреченной русской литературы : в 2 т. / Н. Тихонравов. М., 1863. Т. 2.

Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : в 5 т. / пад агул. рэд. К. К. Атраховіча (Кандрата Крапівы). Мінск, 1978. Т. 2.

*Токарев, С. А.* Ранние формы религии / С. А. Токарев. М., 1990.

*Токарев, С. А.* Религиозные верования восточнославянских народов XIX — начала XX века / С. А. Токарев. М. ; Л., 1957.

*Толстая, С. М.* Заметки по славянскому язычеству / С. М. Толстая, Н. И. Толстой // Обряды и обрядовый фольклор. М., 1982.

*Топоров, В. Н.* Еще раз о Велесе-Волосе в контексте «основного» мифа. Тез. докл. Второй Балто-славянской конф. (Москва. 29 ноября — 2 декабря 1983 г.) / В. Н. Топоров. М., 1983.

*Трыфаненкава, М. А.* Матыў змеяборства ва ўсходнеславянскай традыцыі. Генезіс. Семантыка / М. А. Трыфаненкава. Мінск, 2003.

*Ушаков, Д. Н.* Материалы по народным верованиям великорусов / Д. Н. Ушаков // Этнографическое обозрение. 1896, № 2—3.

*Фаминцын, А. С.* Божества древних славян / А. С. Фаминцын. СПб., 1884.

*Фрезер, Дж.* Золотая ветвь: Исследование магии и религии / Дж. Фрезер. М., 1980.

Холмогорская летопись // ПСРЛ. 1977. Т. 33.

Хрестоматия по истории южных и западных славян : в 3 т. Минск, 1987. Т. 1.

Чаго на свеце не бывае : Антырэліг. казкі, анекдоты, прыказкі ўсходнеславян. народаў / уклад. А. С. Фядосік, Г. А. Пятроўская. Мінск, 1990.

Чарадзейныя казкі : у 2 ч. / рэд. В. К. Бандарчык. Мінск, 1973—1978.

*Шаповалова, Г. Г.* Культ дерева в русском свадебном обряде и свадебной лирике / Г. Г. Шаповалова. Л., 1984.

*Шарая, О. Н.* Природа почитания предков / О. Н. Шарая. Минск, 2004.

*Шаховіч, М.* Дэманічныя постаці і з’явы ў народным вераванні на стыку польскай і беларускай культур / М. Шаховіч // Мост праз стагоддзі : зб. навук. прац. Беласток, 1986.

*Швед, І. А.* Космас і чалавек у дэндралагічных кодах беларускага фальклору / І. А. Швед. Брэст, 2006.

*Швед, І. А.* Раслінныя сімвалы беларускага фальклору / І. А. Швед. Брэст, 2000.

*Шейн, П. В.* Белорусские народные песни с относящимися к ним обрядами, обычаями и суевериями / П. В. Шейн. СПб., 1874.

*Шпилевский, П. М.* Беларусь в характеристических описаниях и фантастических ее сказках / П. М. Шпилевский // Пантеон. 1853. Т. 9.

*Шпилевский, П. М.* Исследование о вовколаках / П. М. Шпилевский // Отдельный оттиск «Москвитянина». СПб., 1853. Т. 2.

*Шпилевский, П. М.* Путешествие по Полесью и белорусскому краю / П. М. Шпилевский. Минск, 1992.

*Штернберг, Л. Я.* Первобытная религия в свете этнографии / Л. Я. Штернберг. Л., 1936.

*Штрак, Г. Л.* Кровь в верованиях и суевериях человечества / Г. Л. Штрак. СПб., 1995.

*Щапов, А. П.* Сочинения : в 2 т. / А. П. Щапов. СПб., 1914.

*Энгельс, Ф.* Подготовительные работы к «Анти-Дюрингу» // К. Маркс, Ф. Энгельс. Соч. М., 1968. Т. 20.

*Эргиус, Г. У.* Очерки по якутскому фольклору / Г. У. Эргиус. М., 1974.

Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал. : І. П. Шамякін [і інш.]. Мінск, 1989.

*Янчук, Н. А.* По Минской губернии (заметки из поездки в 1886 году) / Н. А. Янчук. М., 1889.

*Federowski, M.* Lud białoruski na Rusi Litewskiej : w 8 t. / M. Federowski. Kraków, 1897. T. 1.

*Kibort, I.* Wierzenia ludowe w okolicach Krzywicz w powiecie Wilejskim / I. Kibort. Wisła, 1899.

*Moszyński, K.* Kultura ludowa Słowian : w 2 t. / K. Moszyński. Kraków, 1934. T. 2. Cz. 2.

# Змест


Замест уступу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

**Стварэнне Сусвету (Зямлі) паводле беларускай міфалогіі**. . . . . . . . 11
Як пайшоў Сусвет. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
Славянская мадэль стварэння Сусвету . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 21
«Адмыканне» зямлі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
Клятва зямлёю. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49

**Пакланенне стыхіям і іх абагаўленне** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
Агонь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
Міфалагізаваныя ўяўленні беларусаў аб воднай стыхіі . . . . . . . . . . 63
Ачышчальная функцыя вады . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63
Абуджэнне прыроды вадою . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
Вада, водная прастора як абмежавальніца радавых зямель . . . . 78
Павер'і, звязаныя з вадою . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 86
Замоўленая вада. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 93
«Жывая» і «мёртвая» вада . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102
Вецер . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 114
Мароз . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 123

**Шанаванне дрэваў і камянёў**. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 129
Абагаўленне дрэваў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 129
Дрэва сусвету . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 144
Павер'і, звязаныя з дрэвамі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 166
Пакланенне дубу. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 177
Камень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 180

**Вышэйшыя боствы беларускай міфалогіі**. . . . . . . . . . . . . . . . . . . 192
Род . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 192
Пярун . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 194
Вялес (Волас) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 204
Лада . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 211
Купала . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 215
Каляда . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 224

**«Ніжэйшая» міфалогія беларусаў** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 231
Багнік-балотнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 233
Вадзянік. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 236
Ваўкалак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 245

Вуж . . . . . 252
Гадзюка . . . . . 256
Дамавік . . . . . 260
Лесавік . . . . . 274
Ліхаманка . . . . . 281
Мара . . . . . 285
Хлеўнік (хляўнік) . . . . . 288
Русалка . . . . . 291
Чорт (нячысцік) . . . . . 298

**Міфалагізаваныя вобразы звяроў і птушак** . . . . . 310
Воўк . . . . . 310
Ліса . . . . . 324
Заяц . . . . . 329
Верабей . . . . . 331
Зязюля . . . . . 339
Крумкач . . . . . 346
Певень . . . . . 351

**Жыллё ў міфалогіі беларусаў** . . . . . 356
Акно . . . . . 356
Парог . . . . . 366
Печ . . . . . 374
Комін . . . . . 381

Заключэнне . . . . . 390

Спіс выкарыстанай літаратуры . . . . . 391

Навукова-папулярнае выданне

**Ненадавец** Аляксей Міхайлавіч

**МІФАЛОГІЯ МАІХ ПРОДКАЎ**

Рэдактар *Н. А. Галкоўская*
Мастацкі рэдактар *Н. Р. Агародная*
Тэхнічны рэдактар *С. Л. Печанёва*
Стылістычныя рэдактары *Н. Г. Баранава, Ю. М. Уланава*

Падпісана да друку 26.10.2018. Фармат 70×100 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 32,5. Ул.-выд. арк. 30,0. Тыраж 900 экз. Заказ

12+

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/4 ад 09.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск, Рэспубліка Беларусь.
http://belarusbook.by

Адкрытае акцыянернае таварыства «Друкарня “Перамога”».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/38 ад 29.01.2014.
Вул. Таўлая, 11, 222310, г. Маладзечна.